# СУІЦЫД НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У XIX СТАГОДДЗІ

***Н. І. Станкевіч***

*Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы, Рэспубліка Беларусь, г. Гродна, вул. Ажэшка, 22, nata.wdfk@tut.by*

Мы ўжо звыкліся з тым фактам, што ў беларускай гісторыі існуе вялікая колькасць спробаў самагубства сярод вядомых палітычных і культурных дзеячаў. Многім вядома, што Тадэвуш Рэйтан, палітычны дзеяч, які выступаў супраць першага падзелу Рэчы Паспалітай, спрабаваў скончыць жыццё самагубствам. Кацярына II, расійская імператрыца, таксама спрабавала прыбегнуць да суіцыду па прычыне таго, што “такая полная волнений жизнь и столько со всех сторон несправедливостей заставили думать, что смерть предпочтительнее такой жизни”. Але скончвалі жыццё не толькі вядомыя і багатыя людзі, але і бедныя – сяляне і мяшчане. І мы нячаста задумваемся, чаму людзі прыбягалі да суіцыду ў XIX ст.? Якімі спосабамі яны здзяйснялі самагубствы? Ці пераплятаюцца прычыны, спосабы і фактары ўплыву самазабойстваў XIX ст. з сучаснасцю?

***Ключавыя словы:*** суіцыд; беларускія землі; самазабойствы; прычыны суіцыда.

# СУИЦИД НА БЕЛОРУССКИХ ЗЕМЛЯХ В XIX ВЕКЕ

***Н. И. Станкевич***

*Гродненский государственный университет имени Янки Купалы, Республика Беларусь,г. Гродно, ул. Ожешко, 22, nata.wdfk@tut.by*

Мы уже привыкли к тому факту, что в белорусской истории существует большое количество попыток самоубийства среди известных политических и культурных деятелей. Многим известно, что Тадеуш Рейтан, политический деятель, выступавший против первого раздела Речи Посполитой, пытался покончить жизнь самоубийством. Екатерина II, российская императрица, тоже пыталась прибегнуть к суициду по причине того, что "такая полная волнений жизнь и столько со всех сторон несправедливостей заставили думать, что смерть предпочтительнее такой жизни". Но заканчивали жизнь не только известные и богатые люди, но и бедные – крестьяне и мещане. И мы нечасто задумываемся, почему люди прибегали к суициду в XIX в.? Какими способами они совершали самоубийства? Переплетаются ли причины, способы и факторы влияния самоубийств XIX в. с современностью?

***Ключевые слова:*** суицид; белорусские земли; самоубийства; причины суицида.

# SUICIDE ON BELARUSIAN LANDS IN THE XIX CENTURY

***N. I. Stankevich***

*Yanka Kupala Grodno state University, Republic of Belarus, Grodno, 22 Ozheshko str., nata.wdfk@tut.by*

We are already used to the fact that in Belarusian history there are a large number of suicide attempts among famous political and cultural figures. Many people know that Tadeusz Reitan, a politician who opposed the first partition of the Polish–Lithuanian Commonwealth, tried to commit suicide. Catherine II, the Russian Empress, also tried to run to suicide because "such a life full of excitement and so many injustices on all sides made it seem that death is preferable to such a life." But not only famous and rich people ended their lives, but also the

poor – peasants and burghers. And we don't often wonder why people resorted to suicide In the nineteenth century.? How did they commit suicide? Are the causes, methods and factors of influence of suicides of the XIX century intertwined with the present?

***Keywords:*** suicide; Belarusian lands; suicides; causes of suicide.

XIX ст. – супярэчлівы і складаны перыяд. Менавіта ў гэты час на беларускіх землях змяніўся ўвесь уклад жыцця людзей, бо яны аказаліся пад уладай Расійскай імперыі. У грамадстве адбываліся сур'ёзныя змены: на беларускіх землях апынулася шмат расійскіх чыноўнікаў, улады пачалі прымушаць народ прымаць праваслаўную веру. Не раз з боку беларусаў падымаліся паўстанні, накіраваныя на захаванне Рэчы Паспалітай. Змены закранулі і эканоміку: адкрываліся фабрыкі, актыўна развівалася прамысловасць. Гэтыя працэсы, несумненна, уплывалі на жыццё людзей, і кожны ўспрымаў гэта па–свойму. Некаторыя змаглі прыспасобіцца да новага жыцця, а некаторыя – не. Дарэчы, беларускія землі, у большай частцы Менская, Магілёўская, Віцебская, Гарадзенская і Віленская губ., уваходзілі ў лік губерняў з высокім паказальнікам самагубстваў.

Самазабойствы як сацыяльная з'ява насілі ўсесаслоўны характар, але прычыны для сялян, мяшчан, шляхцічаў былі розныя: дрэнны маёмасны стан, цяжкая хвароба, нешчаслівае каханне, сваркі з адміністрацыяй, страх перад пакараннем за здзейсненае злачынства і інш. Яны залежалі ад гендэрнага фактару. Напрыклад, жанчыны больш уражлівыя, таму яны часцей скончвалі жыццё праз нешчаслівае каханне, а мужчыны часта здзяйснялі суіцыд таму, што гублялі рэпутацыю ў грамадстве (спусташэнне гаспадаркі, вялікія даўгі і інш.).

Дынаміка самазабойстваў была таксама featsрознай. У спакойныя часы самазабойстваў было менш, а падчас лёсаносных для дзяржавы падзей (вайна з Напалеонам Банапартам 1812 г., паўстанні 1830–1831 і 1863–1864 гг., накіраваныя на захаванне Рэчы Паспалітаў у межах 1772 г.) колькасць самазабойстваў значна павялічвалася (прычыны апісваюцца ў артыкуле).

Самазабойстваў сярод жанчын было менш, чым сярод прадстаўнікоў мужчынскага полу, і адносіцца дадзены факт для прадстаўнікоў кожнага саслоўя, як для сялян, так і для шляхты. Напрыклад, у 1870–1894 гг. здзейснілі суіцыд 4.1 % мужчын, а жанчын – 1 % [1]. К. Весялоўскі, рускі эканаміст і географ XIX ст., тлумачыць гэта "пластычнасцю жанчын, накіраванасцю іх душ унутр сябе, мужчыны жа знаходзяцца ў барацьбе са светам, з самімі сабой, таму ім цяжка прыспасобіцца да умоў, якія з'яўляюцца для іх непрыемнымі" [3, с. 22].

Улада адносілася да спроб самагубства сярод грамадства варожа. Дзяржаўнае заканадаўства Расійскай імперыі, якое распаўсюджвалася і на беларускія землі, трактавала самазабойства як злачынства і карала за

замах. Ваенным і Марскім артыкуламі Пятра І пастанаўлялася, што "ежели, кто себя убьет, то мертвое его тело, привязав к лошади, волоча по улицам, за ноги повесить, дабы, смотря на то, другие такого беззакония над собою чинить не отваживались". Па зводу крымінальных законаў, той, хто спрабаваў скончыць жыццё самагубствам, павінен быў быць адпраўлены на катаржныя працы і быць пазбаўленым хрысціянскага пахавання. Трэба зауважыць, што самазабойцы, якія спрабавалі зысці са свету жывых у стане страты розуму ці псіхічнага засмучэння, каральнымі не былі. Гэта спрыяла таму, што часта родзічы ці суседзі самазабойцы хлусілі аб тым, што ён быў у стане страты розум, і вялікую частку самазабойцаў улада не карала [17].

Верным саюзнікам улады ў барацьбе з самагубствамі з'яўлялася царква. Добраахвотнае пазбаўленне сябе жыцця, нават калі яно ўяўляе сабой уцёкі ад пакут, заўсёды ўспрымалася як тяжкі грэх, які Царква на зямлі ўжо не магла адпусціць. Па царкоўных канонах самагубцаў і нават падазраваных у самагубстве нельга было адпяваць у храме, памінаць у царкоўнай малітве.

На аснове ведамасці здзейсненых самагубстваў у Ваўкавыскім уездзе ў 1841 годзе прааналізуем асноўныя спосабы суіцыду. Першае месца займае самапавешанне (у Ваўкавыскім уездзе за 1841 год павесілася 5 чалавек), што тлумачыцца даступнасцю гэтага спосабу (вяроўка і мыла, неабходныя для самазабойства дадзенага тыпу, былі ў кожнай хаце). Далей з вялікім адрывам ідуць:

*Прымяненне агнястрэльнай і халоднай зброі.* Трэба адзначыць, што спроба скончыць жыццё дадзеным спосабам была характэрна ў асноўным для прадстаўнікоў шляхцянскага круга мужчынскага полу, бо сяляне і мяшчане зброі не мелі па прычыне дрэннага маёмаснага стану, а жанчыны–шляхцянкі не ўмелі ёю карыстацца.

*Утапленне*, характэрнае ў асноўным для жанчын, мабыць, таму, што большая іх частка баялася крыві і жадала лёгкай смерці. Зафіксаваны выпадкі ўтаплення як у адкрытых вадаёмах, так і ў калодзежах. Мяшчане, у адрозненне ад сялян, дадзены спосаб суіцыду, асабліва ўтапленне ў адкрытам вадаёме, выкарыстоўвалі не так часта;

*Атручэнне* (жанчыны часта выкарыстоўвалі раствор фосфарных запалак, мужчыны жа – мыш'як);

*Падзенне з вышыні* [10].

Часцей усяго заканчвалі сваё жыццё самагубствам **сяляне**. Таму спачатку пагаворым пра прычыны самагубстваў сярод сялян. Асноўнымі прычынамі было іх цяжкае прававое і матэрыяльнае становішча, а таксама жорсткасць з боку памешчыкаў і арандатараў. Так, у с. Алексінцы у 1854 г.

селянін памешчыка Альшанскага вешаўся на дрэве, але быў выратаваны, а справу гэтую ўтаілі ад паліцыі. У архівах сказана, што “в прошлом 1854 г. помещик Ольшанский, имея к крестьянину своему Луке Дузяку злобу, наказывал его разновременно несколько раз” [4].

У XIX ст. часта можна было сустрэць незаконнанароджаных дзяцей сялянак, бацькамі якіх з’яўляліся простыя сяляне ці памешчыкі, якія дзяцей не прызнавалі, а ў маці не хапала грошай самастойна пракарміць дзіця і вытрымаць пазора ад таго, што яна нарадзіла “байструка”, таму ў выніку сялянка забівала спачатку немаўлятка, а потым сябе.

Зразумела, што часта ў сялянскіх сем’ях былі дрэнныя адносіны паміж яе членамі, што парой заходзіла так далёка, што прыводзіла маладых, яшчэ нявопытных людзей да самагубства. Так, сялянка Ігуменскага павет Вера Дзяркач ўтапілася разам са сваім шасцімесячным дзіцём у прыпадку адчаю з–за прыгнёту з боку свёкра і свякрухі [17].

Паміма таго, у сялянскіх сем’ях рукапрыкладства мужыка ў адносінах да жонкі было звычайнай з’явай, таму часта жанчыны зыходзілі з свету таму, што не маглі выцярпець жорсткіх пабоеў з боку мужыка. Як вядома, у тыя часы развод быў забаронены, у сувязі з чым жанчына, хацеўшы пазбавіцца ад здзекаў, здзяйсняла самагубства.

Таксама сялянін мог пакончыць з сабою ў сувязі з забойствам, парой не зусім абгрунтаваным і зробленым у прыпадку злосці і агрэсіі. Так, селянін Пінскага павета Пётр Леонавец павесіўся пасля забойства сваёй жонкі Наталлі, здзейсненага з рэўнасці і нежадання далей жыць [17].

Самагубства некаторых сялян было выклікана стратай дарагога чалавека. Так, селянін Навагрудскага павета 51–гадовы Пётр Дроздзь няўдала спрабаваў зарэзацца нажом. Пасля аказання яму медыцынскай дапамогі ён прызнаўся, што падставай да самагубства “паслужыла акалічнасць, звязаная са смерцю яго жонкі, пасля якой адбыўся поўны беспарадак ў сям'і і па гаспадарцы, чаму ён яшчэ ў мінулым годзе вырашыў пакончыць з сабой, так як з кожным днём жыццё для яго станавілася невыносным” [17].

Для сялянскага мужчыны паказальнікам яго статусу з’яўлялася яго гаспадарка, таму ў выпадку спусташэння ці даўгоў часта мужчыны не вытрымлівалі і зыходзілі са свету.

Таксама прычынай самагубства, характэрнай менавіта для мужчын, з’яўляецца п’янства. Часта ў стане моцнага алкагольнага ап’янення мужчыны здзяйснялі суіцыд. Дадзеная праблема была характэрна для мужчын як сталага ўзросту, так і маладога. Праўда, у рэдкіх выпадках гэта адносілася і да жанчын, часцей да тых, хто займаўся прастытуцыяй [20].

Прычынамі суіцыду сялянскіх дзяцей з’яўляліся няўдачы ў вучобе, гвалт з боку равеснікаў і канфлікты з настаўнікамі. Праўда, на вёсцы было мала адукаваных людзей, таму дадзеная прычына не была распаўсюджана.

Незалежна ад гендэрнага фактару зыходзілі са свету тыя, хто пакутаваў ад цяжкой хваробы ці псіхічнага растройства. Сярод сялян, у параўнанні з іншымі саслоўямі, гэтыя прычыны былі больш распаўсюджаны, таму што сувязяў з дактарамі практычна не было, а прычын для псіхічнага растройства таксама было значна больш, чым у шляхты (цяжкі маёмасны стан, нараджэнне “байструка” і г.д).

Даследчык П. Сарокін у сваёй працы адзначаў, што “больш іх (г. зн. самагубстваў) летам, затым варта вясна, за вясной восень, а мінімум прыходзіцца на зіму [20, с. 45]. У аграрным календары менавіта лета з'яўлялася для сялян самым цяжкім перыядам, які патрабуе ад іх максімальнага напружання фізічных і душэўных сіл. Напэўна, некаторым з іх не хапіла моцы ў барацьбе з жыццёвымі выпрабаваннямі [16]. З гэтай жа прычынай можна звязаць і той факт, што колькасць самагубстваў узрастала ў неўражайныя гады.

Месца самагубства, як правіла, выбіралася побач з домам, часцей за ўсё гэта былі гаспадарчыя пабудовы: хлеў, гумно, лазня і т. п. Радзей павешаных знаходзілі ва ўласным доме або ў яго сенцах [16].

Трэба таксама адзначыць, што некаторыя сяляне здзяйснялі самагубства ў гарадах. Сарокін, выяўляючы прычыны гэтай з'явы, адзначаў: “Селянін прыходзіць у горад, трапляе ў шумны, мнагалюдны натоўп, становіцца “фішкай” і “нумарам”; глыбокае адзіноцтва і адсутнасць падтрымкі ў патрэбную хвіліну даводзіць адных да злачынства і запою, іншых – да адчаю і смерці” [20, с. 33].

**Гарадскія жыхары (мяшчане)** былі менш схілены да суіцыду, але выпадкаў таксама было шмат. Падставай да іх маглі быць сур’ёзныя прычыны, у першую чаргу звязаныя з маёмасным ці прафесійным станам, напрыклад, падлог ці выраб фальшывых грошай: “7–го числа в 7 часов вечера в Гродно мещанин еврей Лейба Кемпанский в ночной патруль, будучи пьян, лёг спать. Между тем, подозревая в покупке у еврея фальшивых денег, служитель полицейский Абрамъ, когда нашёл у него спящего 1 рубль, представил их в дом квартальному надзирателю Глотову, то по приходу сего еврей Лейба тотчас был заперт в тёмную каморку, в которой спустя несколько часов найден был мёртвым. На следующее утро было его тело осмотрено врачом, и был найден знак на шее, произведённый при удавлении. Медицинский чиновник свидетельствует, что смертельные последствия последовали от личного удара” [11].

Маладыя мяшчанкі часта падвяргаліся гвалту з боку мужчын, у вынику чаго сканчвали сваё жыццё самагубствам. У 1820 годзе Варвара Жукоўская, мяшчанка, якая была на ўслужэнні ў сям'і адстаўнога унтэр–афіцэра, была ім жа згвалтавана: "25 Июня 1820 г. Юлия Васильковская вышла на базар за покупкою говядины, а она, Варвара, по приказанию Васильковской очищала для варения щавель, то прапорщик Шпарц, посадив её, как одни говорят, на колени, другие, что прижимая к себе и шевеля руками под пахи, что опрокинув на стол, намеревался насильничать. Из–за крика и стремления уйти была Шпарцем бита по голове и лицу. Она была перепугана каким–то страшилищем" [12].

Праз некаторы час малалетняя дзяўчына атруцілася. Была вялікая верагоднасць таго, што яна скончыла сваё жыццё самагубствам у сувязі з гвалтам мужа Васількоўскай, але "лекарь и старшая повивальная бабка в выдаче свидетельства прописали, что на умершей Варваре Жуковской снаружи никаких изъявительных знаков, кроме сыпости, которая произойти может от ужасных во время конвульсий бросаний. В нижней части всё в надлежащем образе, только невинное место или кожица разорвана, что окровавление причинилось отъ сильных конвульсий, во внутри неосмотрено по причине нездорового бетенного яда" [12].

Магчыма, дыягназ доктара быў сапраўдны, але магло быць і такое, што лекар і павівальная бабка сказалі гэта пад націскам унтэр–афіцэра, які жадаў пазбегнуць турэмнага заключэння.

Маладыя мяшчане маглі накласці на сябе рукі праз нешчаслівае каханне. У Пінску 18–гадовы Фаўст Малінін, які працаваў пісарам у інжынера Дзіміча, застрэліўся ў публічным доме. Прычына яго самагубства стала вядома паліцыі па пакінутых ім нататках і вершах на двух пустых каробках з–пад цукерак, у якіх ён просіць не вінаваціць нікога ў ягонай смерці, бо ён пазбаўляе сябе жыцця добраахвотна з–за кахання да прастытуткі Хенрыкі Гуткоўскай.

Так, мінскі мяшчанін Якаў Захараў атруціўся мыш'яком з–за адмовы каханай дзяўчыны выйсці за яго замуж [7].

Сярод мяшчанскіх дзяцей ва ўзросце ад 8 да 18 гадоў назіраўся рост самазабойстваў на экзаменацыйную пару. Прычыны гэтых самазабойстваў былі звязаны з немагчымасцю ўсталявання добрых кантактаў з равеснікамі, а ў большасці з няўдачамі ў вучобе і канфліктах з настаўнікамі. Вядома, што ў школах XIX ст. былі жорсткія спосабы навучання. Яны ўключалі і метад устрашэння, і фізічныя пакаранні, таму дзеці баяліся пакарання. Так, сын рэвізора Маскоўска–Брэсцкай чыгункі, вучань 3 класа мінскай гімназіі Аляксандр Пятроў застрэліўся, пакінуўшы

запіску бацькам з тлумачэннем прычыны тым, што ён не перайшоў у наступны клас [8].

Расчараванне ў жыцці, немагчымасць дасягнуць жаданага таксама станавіліся прычынай самагубстваў маладых людзей. Дачка пінскага мешчаніна Цяльпук Найдзіч атруцілася карболовой кіслатой таму, што не паступіла на акушэрскія курсы за адсутнасцю сродкаў [17].

Мяшчане маглі здзейсніць самагубства і праз бедны маёмасны стан. Напрыклад, Борах Зайдэнберг, былы рабочы тытунёвай фабрыкі, зайшоўшы ў малітоўную школу «Клойс» у г. Пінску, атруціўся карболавай кіслатой. Тым, хто прыбег на дапамогу, ён патлумачыў свой учынак тым, што яму няма чаго есці [9].

Таксама мяшчане прыбягалі да суіцыду, калі іх падазравалі ў забойстве.

У **шляхты** былі іншыя прычыны для таго, каб “налажыць на сябе рукі”. Важную ролю іграў узрост самазабойцы. Калі гаворка ідзе аб сталых палітычных дзеячах, то яны забівалі сябе ў асноўным праз тое, што не маглі адстаяць сваю пазіцыю, прыкладам чаму з’яўляецца жыццё Тадэвуша Рэйтана – адданага Бацькаўшчыне чалавека, які пад час першага падзела Рэчы Паспалітай у знак пратэсту лёг у парозе, загарадзіўшы дарогу паслам сейма. А потым, у 1795 г., дазнаўшыся аб тым, што яго Радзіму ўсе–такі разрабавалі, павесіўся.

Таксама прычынай суіцыду маглі з’яўляцца цяжкія адносіны падначаленага з кіраўніцтвам ці супрацоўнікамі, прыкладам чаму служыць жыццё шляхціча Ігнація Ігнатовіча Ваўкавыскага уезда, які застрэліўся з ружжа па прычыне таго, што адміністрацыя падазравала яго ў злоўжыванні абавязкаў: “В седьмой департамент по рассмотрению дела, поступившего на ревизию из Волковысского гродского суда о застрелившем себя из ружья шляхтича Игнатия Игнатовича решением 13 дня 1820 года заключено: как из произведенного по сему делу открывается, что служитель в имении графини Потоцкой писарем питейного дохода шляхтич Игнатий Игнатович марта в 14 день 1819 года выстрелил из ружья наедине и никто к смерти его непричиним. Поводом для совершения такового зла над собой было нечто иное, как собственная его страсть досады, увеличившаяся от подозрения администрации в злоупотреблении его, Игнатовича, своих обязанностей” [14].

У газеце “Наш край”, якая выдавалася ў Брэст–Літоўску, апісваецца самагубства станавога, верагодна, па гэтай жа прычыне: “На хуторе Фролово Саратовской губернии застрелился пристав–дворянин Сутулов. Причина загадочная. Самоубийство совпало с приездом на хутор окружного атамана и судебного пристава” [13].

Таксама асобным пунктам трэба выдзеліць **ваенных**. Пад час вайны 1812 года, якая адбылася на значнай частцы беларускіх зямель, назіраліся выпадкі, калі на фронце ваенныя самі забівалі сябе ці прасілі іх забіць, каб не пакутаваць. З успамінаў французскага афіцэра Комба аб бітве пры Барадзіно, калі адзін цяжкапараненны польскі афіцэр папрасіў забіць яго: "Узарваная граната адрэзала яму пазваночнік і бок, гэтая жудасная рана, здавалася, была нанесеная вострай касой" [25, с. 42]. Комб не змог выканаць просьбу параненага, аднак даў яму пісталет: "Я ўсё ж паспеў заўважыць, з якой дзікай радасцю схапіў ён пісталет, і я не быў ад яго далёка, як ён пусціў сабе кулю ў лоб" [25, с. 44].

У Вільні жа адбываліся выпадкі свядомага самаспалення сярод французаў. З успамінаў графіні Шуазель–Гуффье: "Нягоды настолькі пагасілі ў няшчасных палонніках самасвядомасць жыцця, што, ахопленыя непераможнай апатыяй, яны падпальвалі пол сярод пакоя, садзіліся вакол і падвяргалі сябе павольнаму самаспаленню" [18].

У Мінскай губерніі нараду з Санкт–Пецярбургам і Масквою назіралася самая вялікая колькасць самазабойстваў у 1830–40–х гадах. Пасля паўстання 1830–1831 гг., накіраванага супраць уладарання Расійскай імперыі на беларускіх землях і скончанага паражэннем, шматлікія яго ўдзельнікі былі падвержаны высылкам, арэстам і г.д. Некаторыя паўстанцы, сэрцам адданыя справе, не змаглі пераажыць разгрому і вырашылі скончыць жыццё самагубствам. У ліку такіх адзін з актыўных паўстанцаў Міхаіл Валовіч. Ён спрабаваў застрэліцца, але пісталет даў асечку.

Тое ж можна сказаць і аб паўстанні 1863–1864 гг., калі некаторыя яго ўдзельнікі, такія, як Бржэскі Леапольд, які "за намер пазбавіць сябе жыцця" быў асуджаны ваенным судом [19].

Асаблівае месца сярод самагубстваў займаюць тыя, якія здзяйсняліся пад **уздзеяннем уяўленняў аб гонару**. У дадзеную групу можна аднесці суіцыды, выкліканыя жаданнем захаваць дваранскі гонар. XIX ст. спарадзіла так званую амерыканскую дуэль. Сутнасць яе заключалася ў тым, што паядынак паміж яе ўдзельнікамі выключаўся. Наўзамен ім трэба было цягнуць жэрабя. Той, хто яго выцягнуў, абавязваўся ў абумоўлены тэрмін здзейсніць самагубства. Узнікненне такой формы было абумоўлена існавалым пакараннем за ўдзел у дуэлі, яна дазваляла пазбегнуць не толькі кары за паядынак, але і непажаданай агалоскі. Таксама яна магла быць прапанавана тады, калі не прыстала адкрытая дуэль, напрыклад, з–за высокай пасады аднаго з дуэлянтаў або вялікай розніцы ва ўзросце паміж імі.

Рапарт паліцмейсцера даносіць да нас звесткі пра самагубства сына тытулярнага дарадцы Рычарда Лунскага сямнаццаці гадоў, які застрэліўся з рэвальвера на Набярэжнай вуліцы г. Мінска. Паліцыі ён пакінуў запіску з просьбай нікога не вінаваціць у яго смерці. У іншай ж, загадзя адпраўленай гаспадару кватэры, дзе ён жыў, стацкаму дарадцы Язэпу Дулевічу малады чалавек выклаў сапраўдную прычыну – неабходнасць выканаць абавязак па ўмовах амерыканскай дуэлі. Верагодна, гэтым ён спрабаваў пазбегнуць непажаданай агалоскі і даверыў сваю таямніцу іншаму двараніну, які не палічыў патрэбным яе захаваць.

Такім чынам, асноўнымі прычынамі здзяйснення суіцыду з’яўляліся дрэнны маёмасны стан, безрабоціца, цяжкая хвароба, страта аўтарытэту ў грамадстве, нешчаслівае каханне, сваркі з адміністрацыяй, страх перад пакараннем за здзейсненае злачынства. Асноўныя спосабы здзяйснення самагубстваў – утапленне, прымяненне халоднай і агнястрэльнай зброі, павешанне. Трэба заўважыць, што прычыны самагубстваў цалкам залежалі ад гендарнага фактару. Але, кажучы пра суіцыд як пра сацыяльную з’яву, нельга забываць, што ўсё ж такі, у першую чаргу, ён з’яўляецца фактам асабістай біяграфіі, і пры ўсіх дапушчальных абагульненнях і параўнаннях застаецца ўнікальнай падзеяй у кожным асобным выпадку.

Трэба таксама заўважыць, што вынікі даследавання адносяцца менавіта да беларусаў, нягледзячы на тое, што на беларускіх землях пражывалі і яўрэі. Па ўспамінах бабулі – яўрэйкі Паліны Венгеравай, у той час суіцыд сярод яўрэяў быў вялікай рэдкасцю, таму што вера ў слова Бога і замагільнае жыццё прыносіла ім спакой ва ўсіх зямных праблемах [2, с. 125].

У выніку аналіза статыстычных матэрыялаў высокі ўзровень самагубстваў сярод жыхароў беларускіх зямель з’яўляўся адной з важнейшых праблем XIX ст. Дадзены фактар даказвае тое, што грамадства знаходзілася ў нездаровым стане. Але, калі правесці паралель паміж мінулым і сучасным, то вялікія змены заўважыць цяжка. На сённяшні дзень беларускае грамадства таксама знаходзіцца ў маральным упадку, і сярод беларусаў XXI ст. таксама назіраецца высокі ўзровень самазабойстваў. А. П. Гелда, беларускі псіхіатр, адзначаў, што на сённяшні дзень у асноўным скончваюць сваё жыццё самагубствам тыя, хто займаецца цяжкай фізічнай працай і атрымлівае нізкую зарплату. З гэтага зыходзіць, што асноўнамі прычынамі самагубстваў сярод сучаснага грамадства з’яўляюцца нізкі ўзровень жыцця – дрэнны маёмасны стан. Другаснымі прычынамі з’яўляюцца неўзаемнае каханне, немагчымасць зносіць хваробу і інш.

Прааналізаваўшы прычыны і спосабы здзяйснення самагубстваў у XXI ст. і параўнаўшы іх з сітуацыяй XIX ст., можна зрабіць вынік, што прычыны самагубстваў практычна аднолькавыя, і спосабы таксама не вельмі адрозніваюцца. Самае цікавае, што як у мінулым, так і ў сучасным людзям не хапае грошай, бо асноўнай прычынай самагубстваў у абодвух выпадках з'яўляецца цяжкі маёмасны стан. Але, як пісаў М. В. Шалгуноў, рускі публіцыст і літаратурны крытык, калі ліквідуюцца прычыны, якія ствараюць гэтыя праблемы, знікнуць эканамічныя бедствы, чаму вучаць нас эканамічныя і сацыяльныя веды, то ў такім выпадку знікне палова самазабойстваў. И сапраўды, калі мы не ліквідуем прычыны, якія ствараюць выпадкі самагубстваў, то не пойдзем далей.

***Бібліяграфічныя спасылкі***


1. Алкогольная смертность в Российской Империи в 1870-1894 годах // Институт демографии Национального исследовательского университета "Высшая школа экономики" [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.demoscope.ru/weekly/2011/0461/analit01.php#_FN_16. – Дата доступа: 07. 07. 2018
2. Венгерова П Очерки культурной истории евреев России в XIX в. / П. Венгерова. – Москва, 2003. – с. 234 с.
3. Веселовский К.С Опыты нравственной статистики в России / К. С. Веселовский. – СПб., 1847. – с.39.
4. Дело о покушении на самоубийство крестьянина Дузяка из-за боязни наказания его помещиком Ольшанским за плохо выполненную работу. 16.07.1855г. – 28.07.1855.
5. Екатерина II. Сочинения / Сост. и примеч. В. К. Былинина и М. П. Одесского. – М., "Современник", 1990. – 290 с.
6. Крупская Н. Самоубийства среди учащихся и свободная трудовая школа / Н. Крупская. – Свободное воспитание, 1910-1911. № 10. С. 5.
7. Национальный исторический архив Беларуси. – Ф. 300. – Оп. 1. – Д. 66.
8. НИАБ. – Ф. 295. – Оп. 1. – Д. 7407.
9. НИАБ. – Ф. – 295. – Оп. 1. – Д. 7830.
10. Национальный Гродненский архив Беларуси. – Ф.2. – Оп. 180. – Д. 79
11. НГАБ. – Ф. 2. – Оп. 20. – Д. 49
12. НГАБ. – Ф. 2. – Оп. 18. – Д. 15
13. НГАБ. – Ф. 3. – Оп. 23. – Д. 6
14. НГАБ. – Ф. 2. – Оп. 18. – Д. 47
15. Новосельский С.А. Статистика самоубийств. Отдельный оттиск из журнала «Гигиена и санитария» №№ 8,9,10. СПб. 1910. С. 5
16. Самоубийства крестьян в российской деревне конца XIX – начала XX века // Исторический журнал [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://pandia.ru/text/78/079/73966.php. – Дата доступа: 12. 07. 2018
17. Самоубийства на белорусских землях в начале XX века // Институт белорусской истории и культуры [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://inbelhist.org/samoubijstva-na-belaruskix-zemlyax-v-nachale-xx-veka/. – Дата доступа: 22. 06. 2018

18. Самоубийцы эпохи Наполеона // Все тайны эпохи человечества [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://x-files.org.ua/articles.php?article_id=3587. – Дата доступа: 12. 07. 2018
19. Сводный список участников восстания 1863-1864 г. // Моё семейное дерево [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://pomnirod.ru/materialy-k-statyam/восстания/восстание-1863-1864-г.г/сводный-список-участников-восстания-1863-1864-г.html. – Дата доступа: 12. 07. 2018
20. Сорокин П.А Самоубийство как общественное явление / П. А. Сорокин. – Рига: Наука и жизнь, 1913. – с. 45.
21. Станіслаў Аўгуст Панятоўскі (1732-1798) // Бібліятэка гістарычных артыкулаў [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.jivebelarus.net/history/faces/Stanislaw-August-Poniatowski.html. – Дата доступа: 07.08.2018
22. Суицид в среде крестьянской молодежи (конец XIX — начало XX века) // Электронные журналы [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://e-notabene.ru/hr/article_19039.html. – Дата доступа: 11. 04. 2018
23. Розов Н.И. О наружном осмотре мертвых тел, производимом врачами по требованию полиции. “Архив Судебной Медицины и общественной гигиены" 1869 (1): 81-83
24. Уложение о наказаниях уголовных и исправительных 1845 г. Глава II, раздел 10, стст. 1016, 1017, 1472.
25. Французы в России. 1812 год по воспоминаниям современников-иностранцев. – М., 1912. – с. 144 – 147.